безопасный путь развития. В некоторых государствах (Швеции, Швейцарии и др.) идея общественной обороны признана и утверждена в доктринах безопасности, является объектом политического планирования, практически введена как дополнение (компонент) к силовым средствам сопротивления агрессору.

Ненасилие является предпосылкой нового взгляда на мир и призывает нас, объединившись, сделать все, чтобы построить его. Это — жизненная позиция, являющаяся в то же время моральной.

Все вышесказанное говорит о постепенном формировании «общества антивойны», и данный процесс по оптимистическим прогнозам может занять не менее 1—1,5 веков.

ЛИТЕРАТУРА

1. Ганди М. Моя жизнь.— М.: Наука, 1969.— С. 250, 554—565.
2. Губин В. Д. Русская культура и феномен насилия // Вопросы философии.— 1995.— № 5.— С. 5.
3. Гусейнов А. А. Понятия насилия и ненасилия // Вопросы философии. 1994.—№ 6.— С. 35.
4. Кинг М. Л. Паломничество к ненасилию // Этическая мысль / Общ. ред. А. Гусейнова.— М.: Республика, 1992.— С. 177.
5. Кинг М. Л. Есть у меня мечта...— М., 1970.— С. 66—68.
6. Низинг Й. Общественная оборона как логическая альтернатива: от утопии к выбору.— М., 1993.— С. 146.
7. Шлегель К. Новый порядок и насилие // Вопросы философии.—1995.— № 5.— С. 17.

УДК 378.1

В. А. Кузьміч, ст. выкладчык

## КРЫТЫЧНАЕ МЫСЛЕННЕ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

In article the role of critical thinking in teaching and educational process is opened. The author represents the basic aspects of the new pedagogical approach: independence, statement of questions and finding— out of problems, social thinking, active hearing. Practical examples of use of the principle are resulted.

Імклівае развіццё навукі і тэхнікі ў апошнія гады, а таксама сацыяльна-палітычныя змены ў грамадстве не могуць не адбіцца на сістэме адукацыі. Таму адной з яе галоўных задач становіцца ўкараненне перадавых тэхналогій у навучальна-выхаваўчы працэс. Перш за ўсё нам патрэбны такія падыходы, якія будуць спрыяць актывізацыі самастойнай і творчай працы студэнтаў і дапамогуць будучым спецыялістам адаптавацца да зменлівых умоў жыцця.

Адным з такіх падыходаў, які арыентуе студэнта на свядомае ўспрыняцце ведаў і актыўнасць у навучальнай дзейнасці, з'яўляецца крытычнае мысленне.

Паспрабуем прыйсці да разумення крытычнага мыслення праз выяўленне яго асноўных рысаў. Па-першае, крытычнае мысленне патрабуе ад студэнта *самастойнасці*. Яна заснавана на здольнасці студэнтаў самастойна вырашаць пазнавальныя задачы ў працэсе працы над моўным і мовазнаўчым матэрыялам.

У выніку гэтага калектыўны падыход паступова ўступае месца асобаснаму, сутнасць якога не ў фармальных відах працы, напрыклад у дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу, а ва ўспрыманні студэнта як актыўнага суб'екта навучальнага працэсу. Задача выкладчыка пры гэтым заключаецца не толькі ў трансфармацыі ведаў і агульначалавечых уменняў, але і ў абуджэнні свядомасці студэнта, яго матываў і патрэбнасцей у навучанні. Гэта абавязвае выкладчыка роднай мовы штодзённа

ўдасканальваць навучальныя здольнасці студэнтаў, стымуляваць іх да самастойных пошукаў і адкрыццяў.

Мэтанакіраваная, практычная моўная і маўленчая дзейнасць студэнтаў пры асэнсаванні і засваенні моўных фактаў і з'яў, а таксама пры стварэнні ўласных выказванняў у формах звязных тэкстаў розных стыляў і жанраў, распрацоўка творчых праектаў культурна-асветніцкага характару (напрыклад, «Мой радавод. Лёс сям'і ў XX ст.», «Паходжанне назваў зямлі беларускай» і інш.), студэнцкая навуковая праца, удзел у канферэнцыях — усё гэта прывучае студэнтаў да грунтоўнай разумовай працы, вучыць пераадольваць перашкоды на шляху да мэты і тым самым узмацняе пачуццё задавальнення вынікамі ўласнай дзейнасці.

Найбольш прыдатнымі для выпрацоўкі самастойнага навучання ў вышэйшай школе нам бачацца наступныя прадметныя дзеянні:

— камбінаторныя (сінанімічная трансфармацыя сказаў і тэкстаў);

— кваліфікацыйныя (моўныя з'явы і факты падводзяцца пад навуковыя лінгвістычныя паняцці);

— параўнальна-супастаўляльныя (прыём параўнання выкарыстоўваецца на ўсіх этапах асэнсавання моўнай з'явы);

— апісальныя (на аснове прыметаў моўных фактаў і з'яў фармулююцца азначэнні і вывады);

— ілюстрацыйныя (уласныя меркаванні пацвярджаюцца канкрэтнымі прыкладамі з літаратурных крыніц ці навуковых, навукова-папулярных выданняў і інш.);

— маўленчыя (канструяванне і рэканструяванне тэкстаў);

— атэстацыйныя (тэставанне і іншыя віды кантролю).

Такім чынам, добра арганізаваная самастойная праца стымулюе інтэлектуальную дзейнасць студэнтаў, выхоўвае іх волю, развівае мысленне і маўленне, фарміруе самастойнасць як асобасную якасць суб'екта.

Па-другое, крытычнае мысленне пачынаецца *з пастаноўкі пытанняў і высвятлення праблем*, якія неабходна вырашыць і абгрунтаваць з уласнага пункту гледжання. Праблемны падыход асабліва важны пры навучанні мове, паколькі ён актыўна развівае маўленчыя здольнасці і дазваляе ахапіць навучальным працэсам вялікую колькасць студэнтаў. Трэба зазначыць, што менавіта маўленчая дзейнасць, якая праяўляецца ў выглядзе дзелавых перамоў, тэлефонных размоў, рознага роду афіцыйных распараджэнняў, абмеркаванняў разнастайных праблем, тэм і пытанняў, з'яўляецца асновай поспеху будучых спецыялістаў.

Няўдалае вербальнае афармленне добрай справы, выгаднай прапановы, узаемакарысных кантактаў часцей за ўсё можа перашкодзіць дзелавому поспеху. Сучасны студэнт ужо сёння павінен рыхтаваць сябе да прафесійнай дзейнасці, у тым ліку і да ўмення кіраваць той ці іншай установай, прадпрыемствам, фірмай, таму павінен валодаць такімі характарыстыкамі маўлення, як аргументацыя ўласнага меркавання, выкарыстанне статыстычных даных, думак аўтарытэтных і кампетэнтных у пэўнай галіне ведаў асоб, цытат вядомых вучоных, дзеячаў культуры, палітыкі. У вусным выступленні належным аргументам для доказу тых ці іншых думак з'яўляюцца разнастайныя парамоўныя сродкі (тон і інтанацыя голасу; міміка, жэсты; натуральнасць рухаў цела; дарэчныя паўзы; тэмп, гучнасць і мадуляцыя маўлення; пэўны артыстызм прамоўцы, яго кантакт з аўдыторыяй).

Для актыўнай працы студэнтаў неабходны адпаведны арганізацыйна-педагагічны падыход выкладчыка, накіраваны на ўсебаковае развіццё моўных і маўленчых

здольнасцей студэнтаў, павышэнне іх асабістай моўнай кампетэнцыі. Дапамагчы ў гэтым можа рэалізацыя праблемнага падыходу падчас заняткаў па гуманітарных прадметах.

Крытычнае мысленне ёсць *мысленне сацыяльнае*, паколькі праз публічнае абмеркаванне кожная думка правяраецца і ўзгадняецца з поглядам іншых студэнтаў.

Агульнай працы над вышэйзгаданым аспектам спрыяюць разнастайныя формы заняткаў: парнае навучанне і праца ў групах, дэбаты і дыскусіі, розныя віды публікацый пісьмовых і творчых работ (сачыненні па пачатку, трансфармацыйныя практыкаванні, творчыя пераказы і інш.). Да таго ж пры супольнай працы ў студэнтаў выпрацоўваецца моўны этыкет, павага да меркавання калег, уменне адстойваць уласны погляд упэўнена, але ветліва.

Сацыяльнае мысленне таксама карысна для правядзення куратарскіх гадзін (гадзіны, прадугледжаныя на выхаванне студэнтаў), тэматычная накіраванасць якіх можа быць рознай. Пры гэтым выкладчыку варта пазбягаць гатовых адказаў на тыя ці іншыя пытанні, таксама не навязваць студэнтам уласны пункт гледжання. Неабходна ствараць такую дыскусійную сітуацыю, якая вымагала б самастойнага пошуку і актыўнасці студэнтаў. Поспех дыскусіі залежыць ад правільна выбранай зыходнай тэмы, напрыклад:

— Свет прыроды і свет цывілізацыі — ці могуць яны функцыянаваць у згодзе?

— Ад чаго залежыць ступень зацікаўленасці экалагічнымі справамі ў розных краінах?

— Наколькі шырокай можа быць свабода асобы?

— «Тусоўкі» моладзі — спроба знайсці сілу ці схаваць слабасць?

— Што рабіць, калі асабістыя каштоўнасці супрацьстаяць грамадскім?

Такім чынам, крытычнае мысленне забяспечвае ўсебаковае развіццё чалавечай асобы, паколькі ахоплівае і індывідуальны, і сацыяльны аспекты.

Трэба мець на ўвазе і такі момант крытычнага мыслення, як *актыўнае слуханне*. Пад актыўным слуханнем разумеецца такі тып зносін, калі выкладчык падсумоўвае і перафразуе сказанае студэнтамі, для таго каб прадэманстраваць ім, што іх зразумелі і ацанілі. Такі ўдзел выкладчыка забяспечвае паразуменне са студэнтамі і ўсталёўвае больш глыбокі кантакт з імі.

Паколькі крытычнае мысленне заснавана на актыўным удзеле абодвух бакоў, варта было б пералічыць стандарты крытычнага мыслення як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў.

*Для студэнтаў*:

Крытычнае мысленне азначае выпрацоўку ўласнага меркавання; пошук альтэрнатываў; уменне заняць уласную пазіцыю і абгрунтаваць яе; здольнасць выслухаць суразмоўцу; старраннае прадумванне лагічных аргументаў.

Студэнт павінен браць на сябе адказнасць за ўласнае навучанне, выкарыстоўваючы пры гэтым метады даследавання, якія найбольш спрыяюць самастойнаму навучанню. Студэнты арыентуюцца на самастойнае знаходжанне неабходных матэрыялаў і іх вывучэнне. Атрыманыя навыкі і ўменні студэнт павінен накіроўваць на практычнае прымяненне ў сваім прафесійным станаўленні.

*Для выкладчыкаў*:

Выкладчык прыводзіць такія прыклады ўзаемаадносін, якія стымулююць студэнтаў да пастаноўкі пытанняў і пошуку адказаў на іх, а таксама выхоўвае ўзаемную адказнасць за вынікі працы. Выкладчык абавязаны выбіраць тыя методыкі, якія

найбольш адпавядаюць развіццю крытычнага мыслення студэнтаў і іх самастойнасці (дыскусіі і дэбаты, мазгавая атака, інтэрв'ю, аналіз аргументаў «за» і «супраць» і інш. Асноўны абавязак выкладчыка — працягваць свае прафесійнае ўдасканаленне, заснаванае на абмене вопытам і ведамі з калегамі.

Такім чынам, крытычнае мысленне праз актыўны ўдзел студэнтаў ва ўласным навучанні дапамагае пазбавіць іх ад пасіўнага стаўлення да навакольнага свету і спрыяе выхаванню не толькі кампетэнтных спецыялістаў, але і адказных грамадзян краіны.

ЛІТАРАТУРА

1. Перемена. Международный журнал о развитии мышления через чтение и письмо.— Вильнюс, 2001. № 4—6.
2. Плотнікаў Б. А. Кіраўніку аб мове.— Мінск, 2002.
3. Протчанка В. У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове.— Мінск, 2001.
4. Яленскі М. Г. Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове.— Мінск, 1997.

УДК 882.6.09

Т. М. Федарцова, выкладчык

# ВЯНОК САНЕТАЎ: ДА ПРАБЛЕМЫ ЦВЁРДАЙ ВЕРШАВАНАЙ ФОРМЫ

Indicators of maturity and high0 lerel of development of any national culture are a sonnet, a girland of sonnets, a triolet and other hard poetic forms.

The article dwells upon the process of formation and development of a girland of sonnets in Belarussian literature.

Пашырэнне тэматычнага зместу санетыстыкі патрабавала больш глыбокай распрацоўкі тэмаў, што немагчыма было здзейсніць з-за рамкавай абмежаванасці санетнай формы, яе невялікага аб'ёму. Менавіта патрабаваннем пашырэння змястоўнасці ў межах традыцыйнай формы была выклікана да жыцця больш складаная архітэктанічная вершаваная структура — вянок санетаў. Гэта аб'яднанне пятнаццаці санетаў у адно змястоўнае кампазіцыйнае цэлае, з агульнай назвай, метрычнай, рытмічнай, інтанацыйна-сінтаксічнай будовай радка і спецыфічнай санетнай рыфмоўкай. Адмысловасць вянка санета заключаецца ў тым, што ў сваім кананічным выглядзе гэта пятнаццаць санетаў, дзе першыя чатырнаццаць звязаны ў своеасаблівае кальцо (вянок), таму што апошні радок кожнага санета (санетны замок) паўтараецца ў першым радку наступнага, а апошні радок чатырнаццатага санета паўтарае першы радок першага санета. Пятнаццаты санет называецца магістралам (ці магістраллю) і цалкам складаецца з першых радкоў папярэдніх чатырнаццаці санетаў, што надае цэласнасць і знітаванасць усяму твору. І толькі адна дэталь канону «згубілася» ў вандроўцы праз сем стагоддзяў — патрабаванне, каб магістрал пісаўся акравершам. Дарэчы, так і напісаны першыя «вянкі», што ўзніклі ў Італіі ў ХШ стагоддзі з-пад пяра Фальгарэ дэ сан Джаміньяна і Вінчэнца Монці. Менавіта гэтыя імёны згадваюцца ў «Паэтычным слоўніку» А. Квяткоўскага.

У славянскім свеце першы вянок санетаў стварыў славенец Францэ Ксаверы Прэшэрн у 1832 годзе.